# ВЕДЫ ЗАМАЦОЎВАЕ ПРАКТЫКА

АГУЛЬНАВЯДОМА, што стваральнікам вуснай паэтычнай мудрасці з'яўляецца народ. Аб гэтым у свой час пісаў М. Горкі: «Народ — не толькі сіла, якая стварае ўсе матэрыяльныя каштоўнасці, ён адзіная невычэрпная крыніца каштоўнасцей духоўных, першы па часе, харастве і геніяльнасці творчасці філосаф і паэт, які стварыў усе вялікія паэмы, усе трагедыі зямлі і найвялікшую з іх — гісторыю сусветнай культуры». Менавіта праз змест фальклору, яго асобныя жанры мы бачым нялёгкае жыццё народа, яго светапогляд, маральна-этычныя і сацыяльныя пытанні той ці іншай эпохі. Вось чаму фальклор займае асаблівае месца сярод іншых відаў мастацтва. Вялікі ўплыў аказала вусная народная творчасць на развіццё мастацкай літаратуры на яе аснове. Былі створаны сапраўдныя шэдэўры сусветнага мастацтва.

Беларускі фальклор па сваёй паэтычнасці і фантазіі, жанрава-стылёвай разнастайнасці не толькі не ўступае, але нават пераўзыходзіць лепшыя ўзоры вуснай народнай творчасці іншых народаў. Не выпадкова менавіта на аснове беларускіх народных паданняў і легенд былі створаны славутыя «Балады і рамансы» А. Міцкевіча, творы У. Сыракомлі, М. Канапніцкай і іншых польскіх рамантыкаў. Сумная і вясёлая беларуская песня стала крыніцай натхнення для заснавальніка польскай нацыянальнай оперы С. Манюшкі, жывіла талент кампазітара М. Агінскага, які напісаў славуты паланез «Развітанне з Радзімай». А які шырокі, не пабаімся сказаць, сусветны рэзананс атрымала творчая дзейнасць ансамбля «Песняры», які таксама ўзрос на глебе беларускай народнай творчасці!

## З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

Для беларускіх пісьменнікаў XIX — пачатку XX стагоддзя Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча фальклор быў першай паэтычнай школай. Менавіта яны, майстры слова, вучыліся ў народа мудрасці, «па-наватарску выкарыстоўвалі невычэрпныя багацці вуснапаэтычнай творчасці», якая выхоўвала лепшыя рысы і якасці ў чалавеку.

Акрамя выхаваўчых якасцей, фальклор мае і вялікае пазнавальнае значэнне. Ён адлюстроўвае асаблівасці рэальнага жыцця, дае глыбокія веды аб быце, працы, светапоглядзе і псіхалогіі людзей. Народная творчасць спрадвеку адлюстроўвала жыццёвыя памкненні і сацыяльныя погляды простых людзей. Яна адыграла значную ролю ў барацьбе народа за свае светлыя ідэалы, за сацыяльныя правы, каб «людзьмі звацца».

Вуснапаэтычныя творы адрозніваюцца не толькі ідэйнай змястоўнасцю, але і высокімі мастацкімі якасцямі. Мастацкая палітра беларускага фальклору вельмі своеасаблівая. Яго нельга атоесамліваць з мастацкай літаратурай. Ён мае свае законы, сваю непаўторную паэтыку, свой мастацкі воблік. Адна з галоўных вызначальных рыс фальклорных твораў — гэта іх вуснае бытаванне, перадача ад аднаго пакалення другому. Разам з тым, у сілу разнастайных прычын (знікненне народных абрадаў, свят, вялікае ўздзеянне тэлебачання і радыё, кардынальная змена ўмоў працы і адпачынку і інш) атрымалася так, што найбольш яркія ўзоры вуснай народнай творчасці засталіся толькі ў памяці старэйшага пакалення. Таму моладзь павінна глыбока асэнсаваць велізарнае значэнне фальклору, беражліва яго збіраць і захоўваць. Гэтай высокароднай справай павінны займацца не толькі студэнты — будучыя філолагі, але і ўсе тыя, хто цікавіцца родным словам, роднай літаратурай.

**Г. ХАРОШКА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# У ПОШУКАХ МОЎНЫХ СКАРБАЎ

Нідзе так не захаваўся фальклор са сваёй непаўторнай паэтыкай і хараством, як на беларускім Палессі. Вядомы фальклрыст А. Я. Багдановіч, бацька славутага паэта, лічыў, што геаграфічнае абмежаванне Палесся дапамагло захаваць рэшткі агульнаславянскай фантастыкі.

Фальклор — неад'емная частка культуры нашага народа, таму яго трэба запісваць і вывучаць. Пасільны ўклад у гэту высакародную справу ўносяць студэнты нашага універсітэта — будучыя філолагі. Кожны год яны выязджаюць на фальклорную практыку ў розныя куткі нашай вобласці, каб сабраць і запісаць ад старажылаў лепшыя ўзоры вуснай народнай творчасці.

Наша група, цяпер ужо БР-22, гэтым летам выязджала на практыку ў вёску Вялікі Бор Хойніцкага раёна — радзіму беларускіх пісьменнікаў Б. Сачанкі, А. Шлега, З. Бяспалага і інш. Сустрэлі нас сардэчныя і чулыя людзі. Яны ахвотна дзяліліся з намі сваім «скарбам»: расказвалі казкі, спявалі песні, якія чулі яшчэ ад сваіх бабуль і матуль. Цікавай была наша першая сустрэча з жыхаркай вёскі, старой бабуляй, якая сама прыйшла да нас, калі даведалася, што мы запісваем абрадавыя песні, казкі, замовы. На нашу заўвагу, што можа ёй цяжка спяваць і лягчэй было б нам проста прадыктаваць словы песень, жанчына запярэчыла: «Песні нельга гаварыць. Іх трэба толькі пець». Наогул, у вёсцы аказалася шмат пажылых людзей, ад якіх мы запісалі цікавыя ўзоры народнай паэзіі. Кожная сустрэча з жыхарамі вёскі ўзбагачала нас духоўна, мы адчувалі сябе прыналежнымі ў нейкай ступені і да гісторыі, і да створаных народам цікавых твораў. Мы засталіся шчыра ўдзячнымі Е. І. Кашперка, К. І. Сачанка, Г. Л. Лук'яненка, Д. І. Харошка і многім іншым вяскоўцам за тое, што яны аддавалі нам увесь свой багаты запас вуснай народнай творчасці.

Цікава тое, што ў вёсцы Вялікі Бор святкуюцца многія абрадавыя святы. На жаль, мы не змаглі прысутнічаць на ад ным з іх — свяце Русалкі.

Адзіная цяжкасць, якая выпала нам на практыцы, — гэта запіс замоў. Не вельмі ахвотна дзяліліся імі вяскоўцы. Але тыя, якія ўдалося запісаць, на нашу думку, вельмі цікавыя па паэтычных сродках, арыгінальныя па зместу.

Менавіта ў час фальклорнай практыкі мы змаглі адчуць першародную чысціню і прыгажосць народнай песні, якая стала крыніцай натхнення для многіх прафесіянальных музычных калектываў. У даным выпадку маецца на ўвазе ансамбль «Песняры». Тут, у Вялікім Боры, ўдзельнікамі ансамбля быў запісаны ад жыхаркі вёскі Л. П. Алікінай варыянт песні-балады пра каліну.

Фальклорная практыка, якая праходзіла ў Хойніцкім раёне, запамяталася нам надоўга. І шчаслівыя першакурснікі нашага факультэта, у якіх цікавыя сустрэчы са стваральнікамі вуснай народнай творчасці яшчэ наперадзе.

**Наталля ПАДОЛЬСКАЯ,**
**студэнтка 2-га курса гістфіла.**

# НЯХАЙ СТАНЕ ТРАДЫЦЫЯЙ

Кожны год пасля летняй экзаменацыйнай сесіі адпраўляюцца студэнты-першакурснікі аддзялення мовы і літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта на фальклорную практыку. У аддаленых вёсках Беларускага Палесся, у памяці жыхароў якіх захаваліся казкі, песні, прымаўкі і іншыя ўзоры вуснай народнай творчасці, студэнты старанна і беражліва збіраюць гэты неацэнны «скарб»: занатоўваюць у сшыткі, запісваюць на магніфатонную стужку. З багатымі набыткамі і цікавымі знаходкамі вяртаюцца яны ва ўніверсітэт, дзе апрацоўваюць пачутае ад людзей старэйшага ўзросту.

Вынікі фальклорнай практыкі сёлетняга года былі падведзены нядаўна на канферэнцыі, якая праходзіла ў актавай зале ГДУ. У ёй прынялі ўдзел другакурснікі гісторыка-філалагічнага факультэта, студэнты 1-га курса, у якіх практыка будзе праходзіць у канцы навучальнага года, выкладчыкі гістфіла У. М. Сабаленка, У. В. Казлоў, П. У. Сяцко, І. Ф. Штэйнер, Л. Л. Дземянцей, П. М. Чайкун, Г. П. Харошка.

Сваімі ўражаннямі аб практыцы, цікавых знаходках, сустрэчах з людзьмі падзяліліся на канферэнцыі студэнткі Г. Семчанка, В. Бірукова, М. Гаркуша, І. Бічан, Н. Падольская.

У час фальклорнай практыкі студэнтаў гістфіла быў зняты невялічкі фільм, які і дэманстраваўся на канферэнцыі. Гледачы змаглі ўбачыць будні студэнтаў-практыкантаў, іх размовы з вяскоўцамі, узоры народных мастацкіх промыслаў: вышываныя ручнікі, сурвэткі, посцілкі і інш.

Правядзенне такіх канферэнцый па выніках практыкі, на нашу думку, вельмі карысна і неабходна. Першакурснікі, якім яшчэ давядзецца выязджаць на пошукі моўных скарбаў, мелі магчымасць ўявіць сабе з расказаў сваіх старэйшых таварышаў па вучобе, з якой беражлівасцю і любоўю трэба адносіцца да збору вуснай народнай творчасці, якая гэта нялёгкая, але патрэбная справа. Няхай жа такія канферэнцыі на гістфіле стануць яшчэ адной добрай традыцыяй.

**Т. ПРАЎДЗІВАЯ,**
**студэнтка групы Р-21.**

# ПЕРШАЯ ПРАВЕРКА

Студэнцкае лета — цікавая пара. Усім надоўга запамінаюцца дні вытворчай і вучэбнай практык, праца ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Піянерская практыка, якую студэнты гістарычнага аддзялення праходзяць пасля другога курса, адрозніваецца сваёй своеасаблівасцю і спецыфічнасцю. У час яе не толькі замацоўваюцца набытыя веды. Праца з дзіцячым калектывам у піянерскім лагеры шмат дае студэнту — будучаму педагогу.

Піянерскі лагер «Арляня», дзе мне давялося працаваць старшым важатым, размешчан у маляўнічым месцы, быццам спецыяльна створаным прыродай для дзіцячай «рэспублікі»: навокал густы сасновы лес і бярозавыя гаі, недалёка — рака Сож. Лагер невялікі, але ў ім ёсць неабходнае — прасторныя карпусы, спартыўныя пляцоўкі і футбольнае поле, пакоі для гульняў, эстрада і інш. Абсталяваць лагер дапамагаюць шэфы — калектывы прадпрыемстваў сувязі г. Гомеля.

У першай змене ў піянерскім лагеры былі створаны чатыры атрады. Для ўсіх іх, дзякуючы начальніку лагера С. С. Гаўрыленка, атрадным важатым Л. Аксіневіч, А. Панькоцай, Т. Церахавай, А. Цыганковай змена прайшла цікава, была запоўнена мноствам захапляльных спраў. Гэта ўрачыстыя лінейкі пры адкрыцці змены і 22 чэрвеня — у Дзень памяці — каля помніка вызваліцелям Гомельшчыны. Пад кіраўніцтвам савета дружыны іх з энтузіязмам падрыхтаваў старшы атрад «Рамантыкі». Гэта і прайшоўшыя з вялікім поспехам некалькі канцэртаў, кастры дружбы, вечары адпачынку, дзень імяніннікa. А піянерам атрада «Рмід», напэўна, больш за ўсё запамятаўся паход у «Партызанскую крынічку». Піянеры актыўна ўдзельнічалі ў ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца», ва ўсесаюзным рэферэндуме «Я галасую за мір!».

Сумна было развітвацца рабятам у канцы змены. Але дружба засталася і, магчыма, яшчэ не раз сустрэнуцца сябры, зноў на цэлы месяц стануць гаспадарамі гасціннага лагера. Усё, што было зроблена за змену, ніколі б не стала такім цікавым без актыўнасці, самастойнасці, часам непрыкметнай, але такой неабходнай работы саміх піянераў: С. Бухтаярава, Л. Лапыш, А. Манастырскага, Н. Хмыровай, І. Трыбілустава і інш.

За час піянерскай практыкі мы ўпершыню атрымалі магчымасць праверыць сваю прафесіянальную падрыхтаванасць. Тут нам вельмі спатрэбіліся веды, набытыя за час вучобы ва ўніверсітэце. Ды і само студэнцкае жыццё, грамадская работа аказваюць значны ўплыў на тое, каб месяц практыкі ў піянерскім лагеры для кожнага з нас прайшоў паспяхова. У той жа час работа з піянерамі — гэта таксама крыніца ведаў і практычных навыкаў.

На наступнае лета важатымі піянерскіх лагераў стане большасць нашых аднакурснікаў. Таму камсамольская арганізацыя курса плануе правесці шэраг мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да піянерскага лета.

**Т. МАСЛЮКОЎ,**
**сакратар камсамольскага бюро 3-га курса гістфіла.**

